**І.І. Бамбешка (Мінск)**

# ФАРМІРАВАННЕ СЕТКІ МУЗЕЙНЫХ УСТАНОЎ ВІЦЕБСКА Ў XIX — ПАЧАТКУ XX СТ.

Аналіз пісьмовых крыніц дазваляе гаварыць аб стварэнні ў Віцебску на працягу XIX — пачатку XX ст. шэрагу музейных устаноў, якія арганізоўваліся пры розных дзяржаўных установах і навуковых таварыствах. Паралельна ішло фарміраванне прыватных збораў.

У 1836 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі разаслала губернатарам цыркуляры аб адкрыцці ў губернскіх гарадах імперыі, у тым ліку ў Мінску, Магілёве і Віцебску, выставак вырабаў мясцовай прамысловасці, якія да гэтага часу ўжо праводзіліся ў Расіі. Гэты вопыт паўплываў на выпрацоўку агульнага плана губернскіх выставак, аўтарам якога быў міністр унутраных спраў Д. М. Блудаў. Паводле плана, галоўная мэта выставак была ў тым, каб «распространять на местах полезные сведения о состоянии и усовершенствовании заводской, мануфактурной, сельской и домашней промышленности и тем самым возбуждать и поддерживать между всеми производящими классами похвальное соревнование к улучшению произведений» [9, арк. 4]. Па задуме міністэрства, выстаўкі павінны былі складацца з двух раздзелаў: пастаяннага і часовага. У першы траплялі прадметы, што набываліся на пастаяннае захаванне для стварэння ў далейшым так званага «Губернскага кабінета ці Музеума», а ў другі — тыя прадметы, якія па заканчэнні выстаўкі вярталіся ўладальнікам [9, арк. 7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Намаганнямі губернскіх улад у жніўні 1837 г. была наладжана выстаўка ў Віцебску [4, арк. 53]. Аднак выстаўка была часовай і не трансфармавалася ў музей, не гледзячы на патрабаванні назвавай інструкцыі. Тым не менш, яна падрыхтавала глебу для стварэння музеяў пры статыстычных камітэтах.

Ініцыятарам стварэння музея пры мясцовым статыстычным камітэце выступіў яго старшыня віцебскі губернатар У. М. Токараў. Штуршком жа да стварэння музея быў удзел Віцебскага статыстычнага камітэта ва Усерасійскай этнаграфічнай выстаўцы 1867 г., дзе яго калекцыі былі адзначаны ганаровай граматай [16, с. 39].

Музей у Віцебску быў заснаваны 29 кастрычніка 1868 г. вядомым віцебскім даследчыкам А. М. Семянтоўскім, які ў той час займаў пасаду сакратара віцебскага статыстычнага камітэта. Асновай для музея стаў скарб, знойдзены ў 1867 г. у Лепельскім павеце, які складаўся з 225 еўрапейскіх манет. У музей па патрабаванні губернскага статыстычнага камітэта паступалі разнастайныя рэдкасці, якія адшукваліся на тэрыторыі губерні. Туды таксама былі перададзены дуплеты з калекцый, якія сабралі сябры Віцебскай археалагічнай камісіі ў час раскопак мясцовых курганоў. А. М. Семянтоўскі перадаў музею 25 старажытных сярэбраных манет, сярод якіх было 10 куфічных дырхемаў [12, арк. 22]. Асобныя прадметы паступалі са збораў калекцыянераў К. Бергнера, археолага М. Ф. Кусцінскага і іншых гісторыкаў-аматараў [8, с. 207; 11, арк. 1 – 16].

Супрацоўнікі Віцебскага статыстычнага камітэта складалі апытальныя лісты, збіралі паведамленні пра археалагічныя помнікі Віцебшчыны. Цесныя сувязі падтрымліваліся з расійскімі навуковымі ўстановамі, якія неаднаразова дапамагалі сябрам статыстычнага камітэта кансультацыямі, перш за ўсё, у справе атрыбуцыі музейных прадметаў [19, с. 55].

Па прычыне адсутнасці экспазіцыйнага памяшкання і грашовых сродкаў асветніцкая работа ў музеі амаль што не праводзілася. І толькі аднойчы ў час мастацка-археалагічнай выставы, арганізаванай А. М. Семянтоўскім у красавіку 1871 г., жыхары Віцебска змаглі пазнаёміцца з яго калекцыяй [10, арк. 122].

Віцебскі губернскі статыстычны камітэт меў абмежаваныя магчымасці для ўтрымлівання і развіцця музея. Захаванне прадметаў у музеі таксама пакідала жадаць лепшага. Б. Брэжга адзначаў, што да 1886 г. пад назвай «музей» існаваў пры камітэце толькі невялікі збор нумізматычных і археалагічных прадметаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадметаў сельскай гаспадаркі і ўзораў народных строяў, якія выпадкова там апынуліся, і «нарэшце» рамесных вырабаў і хатняга начыння мясцовых жыхароў [20, s. 10].

Такім чынам, узнікала неабходнасць фактычнага аднаўлення музея. З сярэдзіны 1880-х гг. мясцовая інтэлігенцыя пачала рабіць захады па рэалізацыі гэтай мэты. Такая ініцыятыва знайшла падтрымку ў віцебскага губернатара В. М. Далгарукава, які ў 1889 г. выдаў спецыяльную адозву да павятовых прадвадзіцеляў дваранства, а таксама сяброў статыстычнага камітэта. У гэтым дакуменце ўтрымліваецца заклік да супрацоўнікаў па меры магчымасці прыняць удзел у развіцці музея. Аднак шырокай грамадскай падтрымкі гэта ініцыятыва не мела, і справа трымалася толькі на актыўнасці некалькіх сяброў [20, s. 10 – 11].

У 1893 г. мясцовая інтэлігенцыя паспрабавала адрадзіць музей. У выніку інтэнсіўнай збіральніцкай працы з'явіліся новыя аддзелы з больш дакладнай сістэматызацыяй: археалогіі, этнаграфіі, нумізматыкі, прыродазнаўства, у якіх захоўвалася 3814 прадметаў [20, s. 12].

Праз год музей адкрылі для вольнага агляду публікі, пра што паведамлялася ў сталічным перыядычным друку [15, с. 3]. Той жа Б. Брэжга адзначаў, што цікавасць да музея з боку публікі ўзрастала. Калекцыі музея прыцягвалі ўвагу і вучоных, у прыватнасці вядомага этнографа і фалькларыста М.Я. Нікіфароўскага. Аднак з-за недахопу памяшкання ў 1901 г. па распараджэнні ўлад у весь археалагічны аддзел і некаторыя іншыя гістарычныя помнікі былі перададзены ў Віцебскі царкоўна-археалагічны музей, а праз 12 гадоў астатнія калекцыі паступілі ў распараджэнне Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (ВВАК). Такім чынам, музей пры статыстычным камітэце перастаў існаваць.

Наступным па часе стварэння з'яўляецца царкоўна-археалагічны музей. Падобныя музеі ствараліся з мэтай збору і захавання прадметаў мясцовай рэлігійнай даўніны. Царкоўна-археалагічныя таварыствы паступова былі адкрыты ва ўсіх епархіях Беларусі. У ліпені 1892 г. інспектар народных вучылішчаў Е. Р. Раманаў звярнуўся да полацка-віцебскага епіскапа Антаніна са службовай запіскай, у якой абгрунтоўваў неабходнасць стварэння ў Віцебску «мясцовага царкоўнага сховішча» для збору помнікаў царкоўнага жыцця мінулага, якія не ўжываліся падчас набажэнстваў, але ўяўлялі гісторыка-культурную каштоўнасць (старажытнае адзенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святароў, званы, планы ўжо не існуючых храмаў і г. д.) [4, с. 222]. Праз пэўны час запіска Е.Р. Раманава была ўхвалена, і праз паўгода стварэнне музея было даручана аўтару прапановы, а таксама выкладчыку мужчынскай гімназіі А.П. Сапунову і свяшчэнніку Мікалаеўскага кафедральнага сабора В.В. Гаворскаму. Яны выпрацавалі статут музея, у адпаведнасці з якім новая ўстанова мела на мэце «захаванне прадметаў царкоўнай даўніны Полацкай епархіі і, па магчымасці, прадстаўленне ходу царкоўнага жыцця ў краі» [17, с. 380].

Адкрыццё Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея адбылося 2 верасня 1893 г. у адным з пакояў архірэйскага дома пры Мікалаеўскім кафедральным саборы (комплекс пабудоў былога езуіцкага калегіума). Музей знаходзіўся ў падпарадкаванні Віцебскага Свята-Уладзімірскага праваслаўнага брацтва. Кіравала музеем спецыяльная камісія, у склад якой ўваходзілі ў розныя часы Е.Р. Раманаў, А.П. Сапуноў, М.Я. Нікіфароўскі, Д.І. Даўгяла, Д. Нікіфароўскі, М.М. Багародскі і інш.

Яшчэ да адкрыцця музея пачалася работа па фарміраванні яго калекцый. А.П. Сапуноў і Е. Р. Раманаў сабралі значную частку прадметаў царкоўнага ўжытку ў віцебскіх цэрквах: Благавешчанскай, Ільінскай, Петрапаўлаўскай і інш. Прадметы царкоўнага находжання паступалі ад розных асоб: епіскапа Антаніна, Е.Р. Раманава, А.П. Сапунова, архіварыуса Віцебскага архіва старажытных актаў Д.І. Даўгялы. Паступова сабраныя прадметы былі класіфікаваны па наступных аддзелах: помнікі рэчавыя (іконы, плашчаніцы, харугвы, статуі і інш.); "свяшчэнныя пасудзіны і начынне" (пацiры, кадзілы, лжыцы і інш.); "святарскае адзенне"; рукапісы; кнігі друкаваныя; малюнкі; фотаздымкі і партрэты; нумізматыка і прадметы пазацаркоўнага ўжытку [14]. У 1905 г. у музеі захоўвалася 1247 прадметаў. Аднак у наступныя гады фарміраванне фондаў замарудзілася [18, с. 59].

На эфектыўнасць дзейнасці музея адмоўным чынам уплывала частая змена яго загадчыкаў. Так, Е.Р. Раманаў у 1895 г. быў пераведзены на новае месца службы ў Гродзенскую губерню; А.П. Сапуноў загадваў да жніўня 1897 г., паколькі атрымаў прызначэнне ў Маскоўскі універсітэт, пасля чаго на чале музея стаў настаўнік Віцебскай мужчынскай гімназіі І.Ю. Сабін-Гус, а затым, з лістапада 1904 г., — выкладчык той жа гімназіі М.М. Багародскі [18, с. 58].

Нягледзячы на шэраг неспрыяльных абставін, у першае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзесяцігоддзе свайго існавання музей развіваўся даволі актыўна: папаўняўся новымі прадметамі, праводзілася вывучэнне музейных прадметаў і нерухомых помнікаў Віцебска, была здзейснена спроба наладзіць асветніцкую дзейнасць. У год у сярэднім музей наведвалі да 1500 чалавек, сярод якіх пераважалі навучэнцы, святары, стараабрадцы. Аднак у далейшым музей страціў падтрымку епархіяльнага кіраўніцтва, прычына таму была ў актыўным зборы уніяцкай гісторыка-культурнай спадчыны [18, с. 58].

У 1913 г. у Віцебску з'явіўся царкоўна-археалагічны камітэт. Быў распрацаваны праект статута таварыства, дзе прапаноўвалася шырокая праграма дзейнасці музея ў розных накірунках. Аднак у сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі гэтыя планы не былі рэалізаваны, і ў красавіку 1919 г. калекцыі Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея перайшлі да Віцебскага губернскага музея.

У 1909 г. у Віцебску была заснавана Віцебская вучоная архіўная камісія. Галоўнай перашкодай для яе эфектыўнай працы было тое, што статут гэтай арганізацыі не быў зацверджаны Міністэрствам унутраных спраў, якое сваю адмову абгрунтавала тым, што ў кастрычніку 1911 г. яно ўнесла ў Дзяржаўную думу законапраект аб мерапрыемствах па ахове помнікаў старажытнасці з прапановай выдаць у заканадаўчым парадку асобнае палажэнне аб губернскіх навуковых архіўных камісіях. Таму вырашэнне пытання адкладвалася да зацвярджэння названага законапраекта [13, арк. 15].

Акрамя архіўнай справы ВВАК займалася пошукам, вывучэннем, апісаннем мясцовых помнікаў. Вынікам гэтай справы стала стварэнне ўласнага музея. Камісія размяшчалася ў будынку губернскага праўлення, музей, архіў і бібліятэка — у кабінеце саветніка губернскага праўлення В. С. Арсеньева і ветэрынарнага інспектара А.І. Пушкарова [5, с. 361].

Пачатак музею паклаў А.П. Сапуноў. Ён ахвяраваў вітрыну з прадметамі, знойдзенымі пры раскопках на Камаровай гары каля г. Люцыну [5, с. 361]. Стацкі саветнік К.І. Арлінскі падараваў музею старадаўні бронзавы медаль, 4 замежныя сярэбраныя манеты і 42 рускія медзяныя манеты — усяго 47 прадметаў [1, с. 3]. У верасні 1910 г. у музеі ўжо захоўвалася 1069 манет і медалёў, 39 медалёў [6]. У 1912 г. К.А. Змігродскі склаў каталог музея, паводле якога ў музеі налічвалася 1690 адзінак захавання, якія былі размеркаваны па наступных аддзелах: рэлігійных прадметаў, выкапнёвых прадметаў, ваеннага, пячатак, мінералогіі і геалогіі, нумізматыкі і рознага [7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная праца па арганізацыі належнага функцыянавання музея клалася на плечы захавальніка музея — К.А. Змігродскага. У яго абавязкі ўваходзіла: улік ахвяраванняў, адкрыццё музея для наведвання публікай, складанне справаздач аб папаўненні музейнага фонду, сістэматызацыя прадметаў і назіранне за іх захаваннем [13, арк. 6].

Істотным недахопам музея была адсутнасць належнай асветніцкай працы ў экспазіцыі па прычыне вялікай нязручнасці памяшкання, хоць супрацоўнікі ВВАК рэгулярна праводзілі публічныя лекцыі і г. д. [2, с. 97].

У 1915 г. ВВАК атрымала магчымасць упарадкаваць свой архіў, бібліятэку і музей у 2-х пакоях ніжняга паверха будынка архіва Віцебскага губернскага ўпраўлення. З гэтай нагоды стварылі спецыяльны будаўнічы камітэт у складзе старшыні ВВАК К.І. Ціхамірава, сяброў П.А. Рэнгартэна, А.П. Сапунова, М.І. Лебедзева [19, с. 163]. Аднак з-за вайны гэта не было рэалізавана.

Пачатак першага дзесяцігоддзя ХХ ст. у Беларусі характарызуецца стварэннем земскіх музеяў. У студзені 1913 г. на пасяджэнні Віцебскага губернскага земства была прынята рэзалюцыя, у адпаведнасці з якой галоўнай задачай санітарнага аддзялення на чале з урачом І.А. Сушкевічам на бліжэйшы час павінна было стаць стварэнне перасоўнага санітарна-гігіенічнага музея-выставы. Аўтары прапановы бачылі ў музеі галоўны сродак папулярызацыі ведаў па санітарыі і гігіене, мяркуючы, што «нагляднасць, якую дапаўняюць нават кароткія тлумачэнні, не можа быць заменена доўгімі чытаннямі і лекцыямі» [3, с. 24]. Сабраныя матэрыялы дазволілі ў перадваенныя месяцы вясны і лета 1914 г. правесці пробныя выставы, якія знаёмілі з асновамі медыцынскіх ведаў, гігіены, барацьбы з інфекцыямі, прапагандаваўся здаровы лад жыцця. У далейшым сабраныя матэрыялы перайшлі да Віцебскага музея санітарнай асветы.

Такім чынам, на працягу XIX — пачатку XX ст. у Віцебску дзякуючы асабістай і грамадскай ініцыятыве быў створаны шэраг музейных устаноў, якія праводзілі работу па дакументаванні гістарычнай і ў некаторых выпадках прыроднай рэчаіснасці, арганізавалі навукова-даследчую дзейнасць, спрабавалі наладзіць навукова-асветніцкую работу на сабраных калекцыях. Аднак па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах гэта праца не заўсёды была паспяховай, але яна стварыла перадумовы для адкрыцця ў 1919 г. Віцебскага губернскага музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура і крыніцы*


1. Археологический подарок // Витебские губернские ведомости. — 1909. — 12 ноября. — С. 3.
2. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея. / А. А. Гужалоўскі. — Мн.: НАРБ, 2001. — 124 с.
3. Доклады второму очередному губернскому Земскому Собранию январской сессии 1913 г. — Витебск, 1913. — Ч. 1. — С. 24.
4. Записки Северо-Западного отделения русского географического общества. В 4 т. — Вильно: Типография А. Г. Сыркина, 1910. — Кн. 1. — 284 с.
5. Записки Северо-Западного отделения русского географического общества. В 4 т. — Вильно: Типография А. Г. Сыркина, 1911. — Кн. 2. — 428 с.
6. Змигродский, К. А. Каталог монет и медалей музея Витебской ученой архивной комиссии / К. А. Змигродский. — Витебск: Типограф. насл. М. Б. Неймана, 1911. — 38 с.
7. Змигродский, К. А. Каталог музея Витебской ученой архивной комиссии / К. А. Змигродский. — Витебск: Типограф. насл. М. Б. Неймана, 1912. — 48 с.
8. Краснянский, В. Краткий очерк музейного строительства в Витебске / В. Краснянский // Віцебскі сшытак. — 2000. — № 4. — С. 206—211.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 9674.
10. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 6. — Спр. 394.
11. НГАБ. — Ф. 2502. — Воп. 1. — Спр. 92.
12. НГАБ. — Ф. 2502. — Воп. 1. — Спр. 156.
13. НАГБ. — Ф. 2649. — Воп. 1. — Спр. 418.
14. Описание предметов древности, поступивших в Витебское церковно-археологическое древлехранилище по ноябрь 1897 года / Сост.: чл. ком. по заведованию Витебск. церк.-археол. древлехранилищем Д. И. Довгялло и Н. Я. Никифоровский. Вып. 1. — Витебск: Губ. типолитография, 1899. — 92 с.
15. Открытие в Витебске историко-культурного и естественнонаучного музея // Минский листок. — 1894. — 22 марта. — С. 3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Отчет о действиях и занятиях Витебского губернского статистического комитета за 1868 год. — Витебск: Типография губернского правления, 1869. — 47 с.
17. Сапунов, А. П. Примерные основания учреждения церковно-археологического музея в Витебске / А. П. Сапунов, Е. Р. Романов, В. В. Говорский // Полоцкие епархиальные ведомости. — 1893. — № 9. — Отдел официальный. — С. 379—382.
18. Хмяльніцкая, Л. У. Віцебскае старажытнае старажытнасховішча: епархіяльны музей або уніяцкі збор? / Л. У. Хмяльніцкая // Беларуска-культурнае ўзаемадзеянне канца XIX — пачатку XX ст. Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння І. Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака ў Беларусі. — Віцебск, 1995. — С. 55—63.
19. Хмяльніцкая, Л. У. Гісторык з Віцебска: Жыццяпіс Аляксея Сапунова / Л. Хмяльніцкая. — Мн.: Энцыклапедыкс, 2001. — 254 с.
20. Brezgo, B. Museja Wi'tebskie / B. Brezgo. — Warszawa, 1926. — 30 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ